Гармонія, якая нараджаецца са сплаву думкі і пачуцця, – вось што такое верлібр. У адрозненне ад канвенцыйных вершаў (якія маюць абавязковыя прыкметы формы – метр, рыфму ці хоць адзін з іх, напрыклад, рытм, інтанацыю), свабодны верш мае значную свабоду, аналітычную, сэнсавую, філасофскую заглыбленасць з апорай на змест, думку, пачуцці. Максім Танк – паэт-наватар. Нацыянальны код паэзіі выразны: родная старонка Пількаўшчына, Нарачанскі край, любая беларуская зямля, вецер над возерам і лесам, хлеб на стале, хата, "пакрытая крыламі ластаўкаў", вокны "зашклёныя вачамі блізкіх", "парог, вычасаны з успамінаў" усіх тых, хто прыходзіў у хату, "дзверы на завесах цвыркуновай песні", сосны ля дому, поле, "накрытае рунню", зорнае неба ў студні, рацэ і азёрах, дарога, якая просіць цішы, лес з ранішняй імжой, людзі і праца – вось вобразы паэтавай песні. М.Танк – паэт глыбокага філасофскага складу, мысліцель. Свет верлібра – складаны. Гэта паэзія пазнання дабра і зла, паэзія ведаў, даверу, маральнай чысціні, спакою і грамадскай мужнасці. Зборнікі: "Мой хлеб надзённы" (1962), "Глыток вады" (1964), "Хай будзе святло" (1972), "Дарога, закалыханая жытам" (1976), "За маім сталом" (1984). Прагу духоўнасці, сугучнасць святла, хараства, дабрыні і маралі выклікаюць верлібры паэта. "Той, хто дрэва садзіў, /Будзе веснім іх цветам, /Той, хто сеяў зярно, /Жытам закалосіцца, /Хто спагадай дзяліўся, /Ажыве ва ўспамінах, /Хто склаў песню народу, /Яе рэхам уваскрэсне". Настаўніцтва і прароцтва складае аснову філасофскай паэзіі класіка.

Паэзія Максіма Танка вартае сусветнага прызнання і мае агульначалавечую каштоўнасць.

**Н. Ю. Паўлоўская**

## НАВУКОВАЕ КІРАЎНІЦТВА ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ КАДРАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ

Паспяховае развіццё грамадства грунтуецца на базавых устаноўках гуманітарных ведаў, неад'емным складнікам яхіх выступае лінгвістыка. Ад таго, якога кшалту спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі будуць рыхтаваць універсітэты і навукова-даследчыя ўстановы, залежыць лёс цывілізацыі homo sapiens. У рэчышчы гэтых працэсаў роля навуковага кіраўніка, характар яго ўзаемадзеяння з аспірантамі ці дактарантамі – гарантыя прагрэсу ў стварэнні суперінтэлектуальнай прасторы, поспеху ў даследчыцкай працы саіскальніка на атрыманне вучонай ступені.

З'яўляючыся вельмі складаным і адказным, навуковае кіраўніцтва – выключна захапляльны, насычаны і адначасова затратны працэс, які патрабуе шмат разумовай энергіі, сіл, вопыту. Навуковы кіраўнік павінен увасабляць рысы настаўніка і псіхолага, эксперта і дарадцы. У першую чаргу, гэта аўтарытэтны вучоны з шырокім кругаглядам, энцыклапедычнымі ведамі, які забяспечвае якасную падрыхтоўку навукова-педагагічных кадраў у пэўнай вобласці ведаў. Ён – спецыяліст, адказны за арганізацыю навуковага дасле-

давання аспіранта ці дактаранта. Аднак навуковаму кіраўніку не варта быць бясспрэчным гуру для маладых даследчыкаў. Найлепшая мадэль падобных узаемаадносін – старшы, вопытны калега, які дапаможа разабрацца ў навуковых тэорыях, канцэпцыях, парадыгмах, выбраць аптымальныя метады даследавання, распрацаваць уласныя методыкі вырашэння праблемы. Гэта, на наш погляд, той баланс, якога трэба прытрымлівацца

Навуковае кіраўніцтва ажыццяўляецца ва ўмовах наступных падыходаў да падрыхтоўкі маладога спецыяліста ў аспірантуры:

1) адукацыйнага, сфакусаванага на фарміраванні выкладчыка ўніверсітэта, гэта значыць, пашырэння яго навукова-метадычнай эрудыцыі;

2) дысертацыйнага, які ўзмацняе даследчыцкі кампанент пры абавязковым напісанні дысертацыі;

3) кваліфікацыйнага, з сумяшчэннем дзвюх вышэйпералічаных пазіцый (Б. І. Бедны, Т. А. Строкава, С. Д. Рэзнік, Л. Б. Эрштэйн ).

Аптымальным варта прызнаць трэці падыход, паколькі ён арганічна спалучае выкананне галоўнай задачы аспірантуры – выхаванне спецыяліста, які ўмее праводзіць і афармляць навуковае даследаванне, дасканала валодае навуковай метамовай плюс засвоіў дбайна адабраныя адукацыйныя дысцыпліны. Гэтую частку магчыма прапанаваць у выглядзе прадметаў на выбар з арыентацыяй на існуючыя ў дадзеных установах навуковыя школы, методыка-педагагічныя накірункі, прыярытэты і інтарэсы саміх аспірантаў. Аднак менавіта выкананне дысертацыйнага даследавання прадстаўляецца асноўным і найбольш складаным відам іх дзейнасці.

Напісанне дысертацыі патрабуе ад даследчыка начытанасці, поўнай засяроджанасці на аб’екце даследавання, штодзённай скрупулёзнай працы, самадысцыпліны. Гэты працэс не церпіць мітусні, спешкі. Для ажыццяўлення даследавання трэба мець не толькі моцную матывацыю, але і дастатковую колькасць часу (вучонымі даказана: кожны дзень толькі для ўваходжання ў сваю тэму неабходна патраціць больш за 20 хвілін), спакой, цішыню, адзіноцтва і, безумоўна, натхненне. Гэта сапраўдная творчасць, якая не фарміруецца ні ў калектыве, ні па загадзе. Таму нагружанасць аспіранта лекцыямі, залікамі, экзаменамі, разнастайнымі мерапрыемствамі перашкаджае якаснаму выкананню дысертацыйнага даследавання.

Што чакае аспірант ад навуковага кіраўніка, якімі асноўнымі прафесійна-асобаснымі кампетэнцыямі ён павінен валодаць?

Па-першае, кіраўніку варта мець навуковую і сацыяльную значнасць: асабісты аўтарытэт і рэпутацыю, запатрабаванасць і вядомасць у навуковых колах, дастатковую колькасць публікацый, пажаданы абароненыя аспіранты і дактаранты. Мэтазгодны яго ўдзел і кіраўніцтва ў складзе дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, што забяспечвае выбар і распрацоўку тэм інавацыйнага характару.

Па-другое, навуковы кіраўнік умее генерыраваць сучасныя ідэі, стратэгічна і нестандартна мысліць, мае глыбокія веды ў сваёй вобласці, шчодра дзеліцца імі і ўласным вопытам, валодае метадалогіяй і методыкамі дасле-

давання, ведае гісторыю навуковых тэорый у сваёй вобласці, яе сувязі з іншымі дысцыплінамі. У пераважнай большасці выпадкаў гэта павінен быць доктар навук, прафесар, які прайшоў усе ступені станаўлення навукоўца.

Па-трэцяе, сапраўдны навуковы кіраўнік адказны і патрабавальны як да сябе, так і да сваіх вучняў. Ён валодае арганізатарскімі якасцямі, уменнем будаваць адносіны з аспірантамі і калегамі. Безумоўна, аспірант у сваім кіраўніку хоча бачыць лепшыя маральныя якасці – сумленнасць, годнасць, незалежнасць, ураўнаважанасць, вытрымку, добразычлівасць, тактоўнасць, гатоўнасць дапамагаць, знаходзіць выхад з тупіковых сітуацый у ходзе даследавання.

Напачатку працы менавіта навуковы кіраўнік прапаноўвае тэму дысертацыі, дапамагае аспіранту фармуляваць мэту і задачы, якія ў працэсе выканання даследавання могуць карэкціравацца, вызначае паслядоўнасць яго этапаў з улікам спецыфікі навуковых інтарэсаў саіскальніка, ступені яго падрыхтаванасці, што зараз мае намінацыю індывідуальнай навуковай траекторыі. Значная роля адводзіцца кантролю, які дазваляе трымаць даследчыцкую дзейнасць у межах устаноўленага плана.

Сучасная навука немагчыма без кааперацыі і супрацоўніцтва, таму адным з фактараў паспяховага навуковага кіраўніцтва можа выступаць удзел аспірантаў і дактарантаў у выкананні задання агульных навуковых праграм. Тэматыка, мэты і задачы дысертацый пры гэтым павінны карэліраваць са зместам гэтых праектаў. Вырашэнне адзіных для калектыва праблем дысцыплінуе саіскальнікаў, павышае значнасць іх уласных даследаванняў, дае магчымасць вучыцца рабіць агульныя вывады, устанаўліваць залежнасці і заканамернасці, канструяваць мадэлі, распрацоўваць канцэпцыі моўных катэгорый і сістэм. Так, заданне для праграмы «Лінгвапрагматычныя катэгорыі блізка- и няблізкароднасных моў у супастаўляльна-тыпалагічным аспекце» можна сфармуляваць у выглядзе наступных этапаў:

1) стварэнне і абгрунтаванне тэарэтыка-метадалагічнай базы даследавання лінгвапрагматычных катэгорый, распрацоўка методыкі іх аналізу;

2) адбор, сістэматызацыя, аналіз фактычнага матэрыялу – рэпрэзентантаў катэгорый на розных мовах;

3) выяўленне падабенстваў і адрозненняў у структуры, семантыцы, прагматыцы разнамоўных адзінак;

4) пабудова семантыка-прагматычных мадэляў моўных катэгорый;

5) устанаўленне тактыка-стратэгічнай арганізацыі катэгорый;

6) вызначэнне тыпаў міжмоўнай эквівалентнасці і індэксаў нацыянальнай спецыфікі моўных сродкаў рэалізацыі катэгорый;

7) выяўленне заканамернасцей функцыянавання сродкаў выражэння катэгорый на блізка- і няблізкароднасных мовах;

8) распрацоўка крытэрыяў ацэнкі сродкаў рэалізацыі катэгорый у мовах супастаўлення.

Стварэнне аптымальнай тэорыі навуковага кіраўніцтва выступае надзённай задачай для ўзнаўлення кадравага патэнцыялу краіны, удасканалення сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, захавання навуковай пераемнасці.